Литература

1. Кириенко, В. В. Прикладная социология в маркетинговых исследованиях : пособие по одноим. курсу для студентов специальности 1-26 02 03 «Маркетинг» днев. и заоч. форм обучения / В. В. Кириенко. – Гомель : ГГТУ им. П. О. Сухого, 2013. – 84 с.
2. Гребенников, И. В. Взаимоотношения родителей и детей // Педагогика. – 2008. – № 3. – С. 48–59.
3. Кириенко, В. В. Семья и семейные ценности в социокультурной палитре современного белорусского общества (на основе данных социологического исследования) / В. В. Кириенко // Психологические основы духовно-нравственного обновления современного общества: тенденции, реалии, перспективы : материалы междунар. науч.-практ. конф., 12 апр. 2018 г. – Костанай, 2018. – С. 275–279.
4. Артеменко, Е. К. Механизмы трансформации семейных ценностей на примере брачных установок населения Беларуси / Е. К. Артеменко // Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. – 2020. – Т. 10, № 2. – С. 116.

УДК 37.091.33-028.22:004.92

# ВІЗУАЛІЗАЦЫЯ ЯК АКТУАЛЬНЫ СПОСАБ ПРАДСТАЎЛЕННЯ ІНФАРМАЦЫІ

**В. А. Сцепчанка**

*Установа адукацыі «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны», Рэспубліка Беларусь*

Навуковы кіраўнік З. У. Шведава

*Дадзены артыкул разглядае паняцце і асноўныя прыёмы візуалізацыі як сучаснага і актуальнага спосабу падачы інфармацыі пры выкладанні беларускай і англійскай моў, разглядаюцца асноўныя віды і формы візуалізацыі.*

**Ключавыя словы:** візуалізацыя, воблака слоў, інфаграфіка, кластэр, прыём INSERT.

# VISUALIZATION AS A CURRENT METHOD OF PRESENTATION OF INFORMATION

**V. A. Stsepchanka**

*Francisk Skorina Gomel State University, Republic of Belarus*

Scientific supervisor Z. V. Shvedova

*This article examines the concept and basic techniques of visualization as a modern and relevant way of presenting information in teaching Belarusian and English, and examines the main types and forms of visualization.*

**Keywords:** visualization, word cloud, infographics, cluster, INSERT technique.

Адукацыйны працэс развіваецца паралельна з сучасным светам і тэхналогіямі. Дадзеная акалічнасць абумовіла развіццё і ўкараненне ў вучэбны працэс прыёмаў візуалізацыі. Тэрмін “візуалізацыя” паходзіць ад лацінскага слова visualis – успрыманы зрокава, наглядна, гэта значыць мае на ўвазе прадстаўленне лічбавай і тэкставай інфармацыі ў выглядзе графікаў, дыяграм, схем, табліц, карт і г. д.” [1, с. 96].

На дадзены момант існуе вялікая колькасць метадаў і прыёмаў візуалізацыі інфармацыі. Найбольш папулярнымі і распаўсюджанымі з’яўляюцца наступныя: воблака слоў, інфаграфіка, кластэры, прыём INSERT. Дадзеныя прыёмы паказваюць сваю эфектыўнасць пры выкладанні беларускай і англійскай мовы, таму што

пазітыўна ўплываюць на ўспрыняцце інфармацыі вучнямі, робяць урокі больш цікавымі і яскравымі, а таксама дапамагаюць засваенню і разуменню складаных тэм і цяжкай інфармацыі. Варта адзначыць, што візуалізацыя дапамагае не толькі вывучыць і засвоіць новую інфармацыю, але і ўзнавіць яе ў памяці вучняў праз некаторы час.

Адным з самых зручных і папулярных метадаў візуалізацыі пры выкладанні беларускай мовы ў школах можна назваць “воблака слоў”. “Воблака слоў” – гэтае візуальнае ўяўленне спісу катэгорый ці тэгаў, таксама званых меткамі, ярлыкамі, ключавымі словамі і да т. п.” [2]. Памер і колер слоў, якія размешчаны ў “воблаку”, дазваляе вызначыць, якія з іх з’яўляюцца больш значнымі ў дадзенай тэме. Прымяняць дадзены метад можна пры вывучэнні граматычных тэм, размяшчаючы асноўную інфармацыю, такую як, напрыклад, пытанні да часціны мовы, яе роля ў сказе, што абазначае дадзеная часціна мовы, самастойная яна, або службовая і гэтак далей. Ствараць “воблака слоў” настаўнік можа як самастойна, так і з дапамогай спецыяльных сайтаў і электронных дадаткаў, такіх як: wordart.com, wordcloud.online, wordscloud.pythonanywhere. Акрамя таго, настаўнік можа прапанаваць стварыць воблака слоў па тэме вучням самастойна, што паспрыяе не толькі лепшаму засваенню тэмы, але і развіццю творчага мыслення.

Наступным вельмі эфектыўным спосабам візуалізацыі з’яўляецца інфаграфіка. Дадзены метад асабліва папулярны пры вывучэнні замежных моў, але яго таксама можна вельмі паспяхова выкарыстоўваць на ўроках беларускай мовы. “Інфаграфіка – гэта графічны спосаб прадстаўлення інфармацыі, візуалізацыя статыстычных дадзеных, мэтай якой з’яўляецца паведамленне аўдыторыі складанай, аб’ёмнай інфармацыі простым, зразумелым, даступным і наглядным спосабам” [3, с. 36].

З дапамогай інфаграфікі настаўнік мае магчымасць структураваць вялікую колькасць інфармацыі, зрабіць яе больш зразумелай і даступнай для вучняў. Нягледзячы на сціспласць прадстаўленай інфармацыі інфаграфіка характарызуецца высокім узроўнем інфармацыйнасці, таму што пры выкарыстанні гэтага прыёма візуалізацыі выдзяляецца толькі галоўная інфармацыя. Настаўнік можа ствараць матэрыялы для інфаграфікі з выкарыстаннем спецыяльных сайтаў, а таксама прапанаваць зрабіць праэкт вучням самастойна, што дапаможа ім навучыцца выдзяляць асноўную інфармацыю па тэме і аналізаваць дадзеныя.

Стварэнне кластараў таксама адносіцца да аднаго з найбольш папулярных спосабаў візуалізацыі інфармацыі на ўроках. “Кластар, або асацыяграма, – гэта педагагічны прыём, які дазваляе вучням свабодна разважаць над якой-небудзь тэмай, а таксама развівае памяць і прасторавае мысленне” [3, с. 40]. Асацыяграма з’яўляецца ўніверсальнай інструментам, які можна эфектыўна выкарыстоўваць на розных этапах урока. Гэты метад дапамагае вучням не толькі паспяхова засвоіць новую тэму, але і паглыбляць свае веды праз паўтарэнне і замацаванне матэрыялу. Выкарыстоўваючы асацыяграму, настаўнік можа стварыць візуальную карту, якая спрыяе лепшаму разуменню сувязяў паміж рознымі паняццямі. Таксама яна стымулюе актыўны ўдзел вучняў у навучальным працэсе, дазваляючы ім выказваць свае думкі і ідэі. У выніку ужыванне асацыяграмы робіць урокі больш інтэрактыўнымі і цікавымі, а таксама спрыяе глыбейшаму засваенню навучальнага матэрыялу.

Працаваць з дадзеным метадам візуалізацыі вельмі проста. Кластар або асацыяграма можа быць створаны вучнямі як індывідуальна, так і ў групах, а таксама ў фармаце сумеснай працы ўсяго класа. Напрыклад, у цэнтры дошкі настаўнік запісвае ключавое слова, якое прадстаўляе асноўную тэму занятку. Затым

ён пачынае дадаваць вакол гэтага слова асацыяцыі, гэта могуць быць словы або словазлучэнні, якія прыходзяць на розум вучням у сувязі з дадзенай тэмай.

Гэты метад не толькі дапамагае вучням актыўна ўдзельнічаць у працэсе навучання, але і садзейнічае больш глыбокаму разуменню матэрыялу. Напрыклад, пры вывучэнні часцін мовы настаўнік можа пачаць з запісу тэмы “часціны мовы” на дошцы. Вакол гэтага слова вучні могуць дадаваць асацыяцыі, такія як “назоўнік”, “дзеяслоў”, “прыметнік”, а таксама іх характарыстыкі і прыклады.

Такі падыход дазваляе стварыць візуальную карту ведаў, якая дапамагае вучням убачыць узаемасувязі паміж рознымі паняццямі і ўмацоўвае іх разуменне. Працуючы ў групах, студэнты могуць абменьвацца ідэямі і абмяркоўваць свае асацыяцыі, што стымулюе калектыўнае мысленне і развівае навыкі камунікацыі. У выніку, выкарыстанне кластараў і асацыяграм робіць урокі больш інтэрактыўнымі і займальнымі, а таксама спрыяе лепшаму засваенню вучэбнага матэрыялу.

Наступным метадам, які набірае папулярнасць сярод метадаў нагляднасці з’яўляецца прыём INSERT. Дадзены метад выкарыстоўваецца ў адукацыйнай практыцы для актывізацыі крытычнага мыслення і ўцягвання школьнікаў у працэс навучання. Гэты прыём дапамагае глыбей асэнсоўваць матэрыял, які вывучаецца, а таксама спрыяе развіццю аналітычных і творчых здольнасцей вучняў. Назва прыёма паходзіць з англійскай мовы: I – interactive N –noting S – system for E – effective R – reading T – thinking. Распрацаваны дадзены прыём быў у 1986 г. Джосафам Воганам і Томасам Эстэсам у іх працы “Reading and Reasoning Beyond the Primary Grades”. У 1997 г. тэхналогія была мадыфікавана амерыканскімі вучонымі Курцісам Мэрэдзітам, Чарльзам Тэмплам і Джынні Стылам, якія распрацавалі тэхналогію развіцця крытычнага мыслення праз чытанне і пісьмо.

Сутнасць дадзенага метаду ў здабыванні новай інфармацыі вучнямі, а таксама вычляненні ўжо вядомай інфармацыі. INSERT актывізуе ўзаемадзеянне вучняў з тэкстам падчас чытання, садзейнічаючы больш глыбокаму разуменню матэрыялу і развіццю крытычнага і аналітычнага мыслення. Гэты метад уключае некалькі этапаў. Спачатку настаўнік прапануе школьнікам сістэму маркіроўкі, якая складаецца з чатырох умоўных маркераў: “✓ ” – для інфармацыі, якая ўжо вядомая вучням, “+” – новая інфармацыя, “–” – калі вучань мае іншае меркаванне, “?” – калі нешта незразумела. Затым вучні чытаюць тэкст, пазначаючы на палях асобныя абзацы і сказы адпаведнымі значкамі, што дапамагае ім засяродзіцца на ключавых момантах. Пасля прачытання інфармацыі яны размяшчаюць свае запісы ў табліцу ці схему ў адпаведнасці з меткамі, што можа выглядаць наступным чынам: новая інфармацыя (+), сумневы (–), пытанні (?) і ключавыя ідэі. На заключным этапе вучні абмяркоўваюць свае запісы ў групах або ў класе, што дазваляе абменьвацца меркаваннямі, знаходзіць адказы на пытанні і паглыбляць веды па тэме.

Ужыванне метаду “INSERT” мае мноства пераваг: ён робіць чытанне больш актыўным, развівае крытычнае мысленне, дапамагае сістэматызаваць веды і паляпшае навыкі камунікацыі. У канчатковым выніку гэты падыход спрыяе лепшаму засваенню навучальнага матэрыялу.

Такім чынам, становіцца зразумела, што сучаная сістэма адукацыі патрабуе ад настаўнікаў інавацыйнасці і развіцця, што пашырае выкарыстанне візуалізацыі на ўроках, так як яе прыёмы дапамагаюць спрасціць працэс засваення вялікай колькасці інфармацыі рознай ступені цяжкасці для вучняў.

Літаратура

1. Федосова, О. А. О значении визуализации учебной информации / О. А. Федосова, Е. Н. Соколина // Проблемы педагогики. – 2018. – № 3 (35). – С. 96–99.

2. Национальный образовательный портал. – URL: https://e-asveta.adu.by/index.php/distancionni-vseobuch/obuchenie-online/sredstva-vizualizatsii-informatsii/78-oblako-slov (дата звароту: 20.04.2025).
3. Практические основы преподавания русского языка как иностранного в условиях цифровой образовательной среды : учеб.-метод. пособие / М. В. Холодкова, О. А. Дронова, Т. А. Дьякова, Ж. И. Жеребцова ; М-во науки и высш. обр. РФ ФГБОУ ВО «Тамб. гос. ун-т им. Г. Р. Державина». – Тамбов : Державинский, 2022. – 96 с.

УДК 159.99

# СОХРАНЕНИЕ НАЦИОНАЛЬНОЙ КУЛЬТУРНОЙ ИДЕНТИЧНОСТИ КАК ФАКТОР УКРЕПЛЕНИЯ ЗДОРОВЬЯ НАЦИИ В УСЛОВИЯХ ГЛОБАЛИЗАЦИИ

**Ли Жохань**
*Белорусский государственный университет, г. Минск*

Научный руководитель Е. В. Столярская

*Исследована взаимосвязь между сохранением национальной культурной идентичности и укреплением здоровья нации в контексте вызовов современной глобализации. На основе анализа социологических данных, белорусских и китайских кейсов и теоретических моделей (культурный капитал Бурдье, концепция «мягкой силы» Ная) в статье рассматривается, как традиционные ценности, ритуалы и языковые практики влияют на формирование здорового образа жизни и социальной сплоченности.*

**Ключевые слова:** культурная идентичность, здоровье нации, глобализация, традиции, молодёжная политика.

# PRESERVATION OF NATIONAL CULTURAL IDENTITY AS A FACTOR IN STRENGTHENING THE HEALTH OF THE NATION IN THE CONDITIONS OF GLOBALIZATION

**Li Ruohan**
*Belarusian State University, Minsk*

Scientific supervisor E. V. Stolyarskaya

*This article explores the relationship between preserving national cultural identity and strengthening national health in the context of the challenges of contemporary globalization. Based on an analysis of sociological data, Belarusian and Chinese case studies, and theoretical models (Bourdieu's cultural capital, Nye's concept of "soft power"), the article examines how traditional values, rituals, and linguistic practices influence the development of healthy lifestyles and social cohesion.*

**Keywords:** cultural identity, national health, globalization, traditions, youth policy.

В условиях стремительного развития современного общества такие современные процессы глобализации, как цифровизация, миграция и культурная гомогенизация угрожают уникальности национальных культур. В Беларуси и Китае, где традиции играют ключевую роль в формировании коллективной идентичности, эти процессы ставят реальный вопрос: как обеспечить физическое и психическое здоровье людей, сохранив их культурное наследие?

Согласно исследованиям, утрата культурной идентичности связана с социальной дезинтеграцией, ростом депрессии и аддиктивного поведения (Всемирная организация здравоохранения, 2023). В Китае, например, урбанизация и вестернизация